




# Навіны Універсітэта культуры і мастацтваў

***У Год малой радзімы на кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў стартаваў праект «Імя на карце Радзімы». Праект распрацавалі студэнты 3-га курса ў межах вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» пад кіраўніцтвам прафесара кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Валянціны Саітавай і старшага выкладчыка кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацыяў Алены Паліцэвіч. Адметнасцю праекта з'яўляецца вывучэнне студэнтамі жыцця і дзейнасці сваіх землякоў.***

Першы этап праекта быў прысвечаны знакамітым выпускнікам факультэта бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці розных гадоў выпуску. Падрыхтоўка спецыялістаў бібліятэчнай галіны пачалася на базе Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага ў год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За дзесяткі гадоў факультэт стаў базай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, якія паспяхова ажыццяўляюць бібліятэчна-інфармацыйнае забеспячэнне розных галінаў і сфераў грамадства, выдатна праявілі сябе і ў іншых абласцях дзейнасці.

Напрыканцы мая на факультэце студэнты 330 М групы (напрамак бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасць, менеджмент) правялі мерапрыемства для студэнтаў малодшых курсаў, на якім былі прадстаўленыя электронныя прэзентацыі і выступленні, прысвечаныя Алене Мазанік, Герою Савецкага Саюза, адной з выканаўцаў плана знішчэння генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ, у пасляваенны час – намесніку дырэктара Фундаментальнай бібліятэкі Акадэміі навук БССР, заслужанаму работніку культуры БССР; легендарнай Алене Бяловай, фехтавальшчыцы на рапірах, чатырохкратнай Алімпійскай чэмпіёнцы, шматразовай чэмпіёнцы свету, сёння прафесару Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры; Таццяне Кузьмініч, намесніку дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, кандыдату педагагічных навук, дацэнту; Інэсе Семчанкавай, бізнес-лэдзі, заснавальніцы і ўладальніку Моднага Дома «Юнона» (Беларусь, Украіна).

Перад прысутнымі выступіла І. Семчанкава, якая, у складаныя часы страціўшы любімую работу ў бібліятэцы, павінна была шукаць сродкі для забеспячэння дастойнага жыцця чатырох дзяцей і асабістага самасцвярджэння. Поспех прынёс бізнес у сферы моды. У 1993 г. Інэса Мікалаеўна заснавала ў Мінску Модны Дом «Юнона». Яна падкрэсліла, што спецыяльныя дысцыпліны, якія вывучаюцца на факультэце, фарміруюць здольнасці да кіравання і сістэматызацыі – найважнейшыя якасці паспяховага менеджара ў модным бізнесе, якія вельмі дапамаглі ёй у арганізацыі і вядзенні ўласнай справы. Студэнты і выкладчыкі пачулі цікавы аповед пра моду і яе новыя накірункі, пра калекцыі сукенак «Юноны», паглядзелі слайд-шоу. У ходзе сустрэчы ўзнікла ідэя рэалізацыі моднага праекта з удзелам студэнтаў пры падтрымцы «Юноны». У Інстаграме Інэса Мікалаеўна напісала: «Беларускі Універсітэт Культуры – ВНУ, у якой я вучылася з захапленнем».

Другі этап праекта «Імя на карце Радзімы» адбыўся ў чэрвені ў форме электронных прэзентацыяў і выставы, якую студэнты (напрамак бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, аўтаматызацыя) прысвяцілі сваім знакамітым землякам і родным мясцінам. Мерапрыемства было прымеркаванае да Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Студэнты распавялі аб смелых і таленавітых людзях, якія нарадзіліся ці жылі ў буйных гарадах, мястэчках і вёсках, і якія абаранялі родную зямлю ад ворагаў ці зрабілі вялікі ўклад у развіццё мастацтва, культуры, спорту. Сярод прадстаўленых асоб ураджэнцы г. Рэчыцы – выдатны мастак Аляксандр Ісачоў і велагоншчык Васіль Кірыенка; Фёдар Крыловіч, выканаўца буйнейшай дыверсіі ў гады Другой сусветнай вайны – узрыву на чыгуначнай станцыі ў Асіповічах нямецкіх эшалонаў 30 ліпеня 1943 г.; мастакі Нікадзім Сілівановіч, ураджэнец вёскі Цынцэвічы (Вілейскі раён) і мінчанін Раман Заслонаў, унук Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава; заслужаны дзеяч культуры БССР Пaўліна Мядзёлка з вёскі Будслаў і многія іншыя.

Актыўнасць студэнтаў, іх выразны інтарэс да мінулага і сучаснасці сваёй малой і вялікай радзімы, паважлівае стаўленне да землякоў падштурхнула да працягу праекта ў новым навучальным годзе і стварэння ў складзе навуковага гуртка кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці студэнцкага цэнтра інфармацыйна-аналітычных даследаванняў «Землякі».

*Валянціна САІТАВА*
*Фота Алены ПАЛІЦЭВІЧ*



# Радзіма пачынаецца з Жодзіна

***З 8 жніўня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Мінску праходзіць выстаўка Мікалая Шышлова «Тут Радзімы маёй пачатак...», прымеркаваная да 55-годдзя горада Жодзіна і да Года малой радзімы.***

М. Шышлоў нарадзіўся ў 1947 г. у Жодзіне. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага ўніверсітэта і аддзяленне мастацкай керамікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Ён – графік, жывапісец, аўтар дробных карыкатураў, тонкіх пранікнёных малюнкаў і акварэльных пейзажаў. Асноўная тэма яго творчасці – Беларусь, прыгажосць яе прыроды, краявіды роднага Жодзіна. На выстаўцы прадстаўленыя працы розных перыядаў, разнастайныя па тэматыцы і тэхніцы выканання.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ